SACRIFICE 316

# Жывая ахвяра

*“Дык прашу вас, браты, праз міласэрнасьць Божую, аддайце целы вашыя на ахвяру жывую, сьвятую, прыемную Богу, на разумнае служэньне вашае, не прыпадабняйцеся веку гэтаму, але перамяняйцеся праз абнаўленьне розуму вашага, каб вам выпрабаваць, што ёсьць воля Божая, што добрае, і прыемнае [Богу], і дасканалае”.* Рымлянам 12:1-2

**Вашая ахвяра.** Заклік прадставіць вашае цела, як *“жывую і сьвятую ахвяру”* часта няправільна разумеюць. Аднак, вельмі важна паказаць вам слушны шлях быць больш чым проста Веруючым у Ісуса Хрыста. Першы верш заклікае Верніка прынесьці Богу пэўную ахвяру пасьля збаўленьня. Другі верш дае інструкцыю для жыцьця пасьля ахвяры. Падпарадкоўвайцеся Богу кожны дзень у межах нясення вашага штодзённага крыжа, Лукі 9:23. Аднак, гэта не да канца адпавядае сэнсу ліста да Рымлянаў 12:1. Загад *“аддаць целы вашыя”* палягае ў тым, каб *раз і назаўжды* прысьвяціць, падпарадкавацца і цалкам аддацца Богу. Гэта не пра збаўленьне. Збаўленьне цалкам палягае на ахвяры Хрыста. Гэта іншае. Гаворка пра вашую ахаваряу. Гэта не штодзённая ахвяра. Гэта вашае безумоўнае, перманентнае пасьвячэньне Богу ў якасьці жывой, сьвятой, прыемнай ахвяры. Гэта ваш добраахвотны дар сябе Богу для Яго славы для Яго неабмежаванага выкарыстаньня.

**Для чаго рабіць гэтую ахвяру?** Па прычыне Яго літасьці. Главы 1-11 ліста да Рымлянаў апісваюць Божую літасьць. Рымлянам 12:1 кажа, што Бог хоча ад вас па прычыне гэтай літасьці. Рымлянам 12:2 утрымлівае два настаўленьні для жыцьця *пасьля* вашай ахвяры. Вялікая Божая лістасьць для выратаваньня і асьвячэньня апісаная ў першых 11 главах. Таму, аддайце сябе Богу. Ён дабраславіць вас у гэтым жыцьці і ў вечнасьці. Аднак, слушная матывацыя для вашай ахвяры не перад вамі. Яна за вамі. Вашая слушная матывацыя палягае ў тым, што Бог ужо зрабіў. Уявіце, што Ісус паказвае вам Свае рукі з дзірамі ад цьвікоў і кажа: “Пасьля ўсяго, што Я зрабіў для цябе, зрабі гэта для Мяне.” У гэтым сэнс ўрыўку Рымлянвм 12:1.

**Чаму гэта аднакротная ахвяра?** Па прычыне сэнса ўкладзенага ў словы ў лісьце да Рымлянаў 12:1-2. Дзеясловы *"не прыпадабняцца”* і *“перамяняцца”* у 12:2 стаяць у цяперашнім часе. Гэта азначае, што трэба рабіць гэтыя дзве рэчы цяпер і цягам усяго вашага жыцця. Аднак, дзеяслоў у *“Аддайце целы вашыя”* ў 12:1 у грэцкай мове знаходзіцца не ў простым цяперашнім часе. У грэцкай мове гэта азначае адзіночную дзею. Гэта не азначае, працягвай так рабіць. Гэта азначае, зрабі раз і назаўсёды. Гэта і ёсьць прысьвячэньне сябе Богу. Аддай сябе ў якасьці ахвяры Богу. Рымлянам 12:1 кажа пра тваю ахвяру Богу. Гэты ўрывак кажа, што ты павінен прынесьці сябе на алтар Бога.

**Дзьве ілюстрацыі.** Другазаконьне 15:12-17 дае добрую ілюстрацыю гэтай зьявы. Вызвалены яўрэйскі раб мог вырашыць *дабраахвотна* і *назаўжды* аддаць сябе ў рабы свайму гаспадару. Гэты выбар мог быць заснаваны на лістасьці яго гаспадара. Такі ўчынак быў выкліканы любоўю раба да свайго гаспадара. Гэта было назаўжды. Вуха раба праколвалі шылам у знак таго, што ён заставаўся слугой свайго гаспадара да канца жыцьця. Захаваньне стану рабства было выбарам раба. Яго не змушвалі. Гэта было рашэньне раз і назаўжды. Іншая ілюстрацыя – гэта прынясеньне ў ахвяру жывёл ў Старым Запавеце. Ахвяра павінна была быць прыемнай, каб быць прынесенай на алтар. Хворая ці дэфектыўная жывёла была непрымальнай, Лявіт 1-5. Гэта ілюструе сьвятую і прыемную ахвяру ў Рымлянам 12:1. Сьмерць прынесенай у ахвяру жывёлы тлумачыць вечнасць ахвяры. Ніводная ахвяраваная жывёла не сыходзіла з алтара, калі там рабілася горача. Ніводзін сьвятар не здымаў ахвяру з алтара, каб прынесьці яе на наступны дзень. Гэта была вечная ахвяра. Калі вы здымаеце вашую ахвяру паводле Рымлянам 12:1 з алтара, калі робіцца горача, значыць, гэтая ахвяра ніколі не была адпаведнай.

**Паўтарэньне вашай ахвяры.** Ці трэба паўтарыць вашую паводле ахвяру Рымлянам 12:1? Так, калі вашая ахвяра не была прыемнай. Паводле Рымлянам 12:1, ахвяра мае быць жывой, сьвятой, і прыемнай. Вы жывыя, бо па веры ў Хрыста, вы *“перайшлі ад сьмерці ў жыцьцё”* Яна 5:24. Быць сьвятой ахвярай – вашая адказнасьць. Ахвяры Старога Запавету павінныя былі быць прыемныя. Жывёла не мусіла быць ідэальнай. Але яна мусіла быць здаровая, без хваробаў, без парокаў. Гэта тлумачыць два аспекты ахвяры паводле Рымлянам 12:1. Па-першае, вашая ахвяра не павінна быць хваравітай. Хвароба граху і аддзяленьня ад Бога павінна быць вылечаная збаўленьнем. Таму, Рымлянам 12:1 напісана толькі для вернікаў (на гэта ўказвае слова “браты” ў гэтым вершы). Ахвяра няверуючых не можа быць прыемнай, бо ахвяра павінна быць прынесеная *пасьля* збаўленьня, а не *перад* ім. Вы павінны прыйсьці да Ісуса перад тым, як ісьці за Ім. Каб быць упэўненым у сваім збаўленьні, наведайце www.Gospel316.org. Урывак пра сьвятое указвае на прымальны ўзровень духоўнай чысьціні ў жыцьці Верніка. Толькі тады ахвяра паводле Рымлянам 12:1 будзе прынята Богам. *”Дык калі хто ачысьціць сябе ад гэтага, той будзе пасудзінаю ў пашане, асьвячонаю і патрэбнаю Уладару, падрыхтаванаю на ўсякую добрую справу”* 2 Цімафея, 2:21. Вы не можаце быць ідэальныя. Аднак, вы можаце прадставіць сябе на належным ўзроўні духоўнага здароўя і сьвятасьці. Пасьля таго, як вашая жывая і сьвятая ахвяра была прынятая Богам, у вас няма патрэбы паўтараць яе зноў. Аднак, калі вашая ахвяра не была прынятая Богам, бо яна была часовая ці не была сьвятой, патрэбнае паўтарэньне. Аддайце сябе як вечную, жывую і сьвятую ахвяру. Добраахвотна і назаўжды станьцеся рабом Божым. Не рабіце гэта вымушана. Гэта вельмі сур’ёзнае рашэньне пасьля збаўленьня. Пасьля таго, як ахвяра была прынятая, перайдзіце да непрыпадабненьня і перамянення жыцьця як сапраўдны паслядоўнік Ісуса Хрыста паводле Рымлянам 12:2. Пасьля ўсяго, што Ён зрабіў для вас – зрабіце гэта для Яго!

**Жыцьцё пасьля вашай ахвяры.** *“Не прыпадабняйцеся веку гэтаму, але перамяняйцеся праз абнаўленьне розуму вашага, каб вам выпрабаваць, што ёсьць воля Божая, што добрае, і прыемнае [Богу], і дасканалае”.* Рымлянам 12:2. Гэты верш дае настаўленьне для жыцьця пасьля вашай ахвяры паводле Рымлянам 12:1. Настаўленьні стаяць у працяглым цяперашнім часе, што азначае заклік не прыпадабняцца і перамяняцца на падставе пастаяннага абнаўленьня вашага розуму. Не прыпадабняйцеся, не пагаджайцеся з грахоўнымі практыкамі гэтага сьвету. Не дазваляйце гэтаму сьвету фармаваць вас як Верніка. Рымлянам 12:2 загадвае вам*: “перамяняйцеся праз абнаўленьне розуму вашага”.* Грэцкае слова, якое перакладзена як *“перамяняйцеся”* – тое самае, якое Ісус выкарыстоўвае ў Эвангельлі паводле Мацьвея 17:2 і Марка 9:2, дзе сцвярджаецца, што Ён *перамяніўся.* Рымлянам 12:2 навучае быць перамененым абнаўленьнем (аднаўленьнем, поўнай зьменай да лепшага) вашага розума. Гэтая метамарфоза (большая за перамену вусеня ў матылька) здзяйсьняецца праз навучаньне і жыцьцё ў адпаведнасьці з Божым словам. Зрабіце вашую ахвяру паводле Рымлянам 12:1. Не ўціскайцеся ў стандарты гэтага сьвету. Але перамяняйцеся ад навучаньня і жыцьця ў адпаведнасьці з Божым Словам. Тады вы спазнаеце Божую волю і зможаце жыць згодна з ёй.

**“Каб вам выпрабаваць, што ёсьць воля Божая, што добрае, і прыемнае [Богу], і дасканалае”.**

**Рымлянам 12:2**

---

*Жывая ахвяра* © 2026. Джон Д. Морыс III апублікавана служэннем Acts One Eight. Вы можаце свабодна друкаваць, капіраваць, публікаваць і дасылаць як паведамленне пры ўмове захавання нязменнасці зместу і ўключэння гэтай заявы. Вы можаце дадаць назву вашага служэньня ці царквы ў верхняй частцы першай старонкі і дадаць кантактныя звесткі над тлустай рысай унізе другой старонкі. *Sacrifice316* грунтуецца выключна на Бібліі. Гэты праэкт існуе, каб дапамагчы людзям духоўна расці і быць больш чым проста Веруючым у Ісуса Хрыста. Вы можаце даслаць мэйл Acts One Eight (па-магчымасьці, па-ангельску) на адрэсу: Hello@Mail316.org. Пераклад быў здзейсьнены www.ChristianLingua.com. *A Living Sacrifice* дасяжны на 48 мовах бясплатна на сайце www.Sacrifice316.org. Біблейскія цытаты ў арыгінальнай англійскай версіі ўзятыя з The Lockman Foundation’s New American Standard Bible 1995. Біблейскія цытаты ў гэтым перакладзе ўзятыя з Бібліі Антонія Бокуна, 2023.